**Н. І. Грышчанка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі

## Спасцігаць жыццёвыя ўрокі на прыкладзе мастацкага твора

Задача настаўніка беларускай мовы і літаратуры – пастаянна фарміраваць і развіваць чытацкую кампетэнцыю. На сённяшні дзень прадметніку неабходна ўбачыць у традыцыйных формах навучання патэнцыял для развіцця чытацкай граматнасці. На ўроку беларускай літаратуры ў 7 класе пры аналізе апавядання Міколы Лупсякова «Мэры Кэт» звычайная, усім вядомая віктарына «Так ці не?» можа праводзіцца наступным чынам: акрамя таго, што падаюцца правільныя і няправільныя сцвярджэнні, кожнай фармулёўцы адпавядаюць індэкс-словы, па якіх вучні пасля выканання вызначаюць тэму заняткаў. Такім чынам, для якаснага выканання дадзенага задання вучням неабходна ўважліва прачытаць мастацкі твор, умець хутка ў ім арыентавацца, а яшчэ расставіць у лагічнай паслядоўнасці словы для фармулёўкі тэмы.

Важна навучыць дзяцей праецыраваць мастацкі твор на рэальнае жыццё. Так, падчас працы з табліцай вучням патрэбна пераасэнсаваць прапанаваную цытату для фармулёўкі парады герою, а гэта значыць і сабе. Настаўніку неабходна паказаць, што кожны мастацкі твор, які ўважліва прачытаны і правільна зразуметы, нясе важны жыццёвы ўрок.

***Урок беларускай літаратуры ў 7 класе па апавяданні Міколы Лупсякова «Мэры Кэт» прадстаўлены на сайце часопіса…***

**Н. І. Грышчанка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1
імя Францыска Скарыны

## Спасцігаць жыццёвыя ўрокі на прыкладзе мастацкага твора

## Урок беларускай літаратуры ў 7 класе па апавяданні Міколы Лупсякова «Мэры Кэт»

Задача настаўніка беларускай мовы і літаратуры – пастаянна фарміраваць і развіваць чытацкую кампетэнцыю. На сённяшні дзень прадметніку неабходна ўбачыць у традыцыйных формах навучання патэнцыял для развіцця чытацкай граматнасці. На ўроку беларускай літаратуры ў 7 класе пры аналізе апавядання Міколы Лупсякова «Мэры Кэт»

класе звычайная, усім вядомая віктарына «Так ці не?» можа выглядаць наступным чынам: акрамя таго, што падаюцца правільныя і няправільныя сцвярджэнні, кожнай фармулёўцы адпавядаюць індэкс-словы, па якіх вучні пасля выканання вызначаюць тэму заняткаў. Такім чынам, для якаснага выканання дадзенага задання вучням неабходна ўважліва прачытаць мастацкі твор, умець хутка ў ім арыентавацца, а яшчэ расставіць у лагічнай паслядоўнасці словы для фармулёўкі тэмы.

Для паглыбленай характарыстыкі герояў можа выкарыстоўвацца традыцыйнае анкетаванне і метад «5 з 25», якія таксама служаць для павышэння чытацкай культуры. Сямікласнікам прапануецца зрабіць асэнсаваны выбар той ці іншай якасці, уласцівай герою. Аргументацыю трэба знайсці ў тэксце, а для гэтага неабходна не толькі добра ведаць змест, але і ўмець вылучаць галоўнае, аргументаваць.

Важна навучыць дзяцей праецыраваць мастацкі твор на рэальнае жыццё. Так, падчас працы з табліцай вучням патрэбна пераасэнсаваць прапанаваную цытату для фармулёўкі парады герою, а гэта значыць і сабе. Настаўніку неабходна паказаць, што кожны мастацкі твор, які ўважліва прачытаны і правільна зразуметы, нясе важны жыццёвы ўрок.

Пры ўмове сістэмнага выкарыстання дадзеных прыёмаў прадметніку ўдасца выхаваць ўдумлівага чытача.

**Тэма.** Мікола Лупсякоў «Мэры Кэт».

**Мэта:** угадаць змест твора, ахарактарызаваць галоўных герояў.

**Задачы:**

- ✓ вызначыць характэрныя рысы Эмы Пшанічнай і Антона Бубнова;
- ✓ удасканальваць уменне працаваць у групах, парах, правільна размяркоўваць час;
- ✓ на прыкладзе мастацкага твора спасцігаць жыццёвыя ўрокі.

## Ход урока

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

– Падыміце руку, калі вы згодны са сцвярджэннем:

1) Я адчуваю сябе зараз камфортна.
2) Мне хочацца адкрываць для сябе новае.
3) Лічу, што мастацкія творы даюць важныя жыццёвыя ўрокі.
4) Сёння на ўроку буду старанна працаваць.

– У нас другі ўрок па апавяданні М. Лупсякова “Мэры Кэт”, адгорнем сшыткі, запішам дату,тэму. Сёння мы будзем працаваць над зместам твора, характарызаваць герояў, спасцігаць жыццёвыя ўрокі.

### II. Аперацыйна-пазнавальны этап

#### 1. Праца над зместам твора

– Першая задача, якая стаіць перад намі, – узгадаць змест твора, для гэтага прапаную выканаць віктарыну “Так ці не?”.

**Віктарына “Так ці не?”**

**Адзначце знакам “+” тое сцвярджэнне, якое, на вашу думку, з’яўляецца правільным, знакам “–“ тое, якое з’яўляецца памылковым.**

1) Янка паведаміў Антону пра тое, што сям’я Эмы Пшанічнай прывезла вялікую колькасць кніг, але гэта былі кнігі толькі замежных аўтараў. **(не)**
2) Антон Бубноў першы раз убачыў Эму на ўроку беларускай літаратуры. **(будзем)**
3) У апавяданні няма апісання знешнасці Эмы. **(дружыць)**
4) Антон Бубноў быў вельмі моцна ўражаны адказам Эмы на першым уроку, у сваёй запісцы прапаноўвае пасябраваць з ім. **(будзем)**
5) Эма Пшанічная пагаджаецца стаць яго сяброўкай, пра гэта паведамляе хлопцу ў запісцы. **(а)**
6) У Антона, калі ён пабачыў, як добра катаецца Эма на каньках, узнікла думка купіць канькі і навучыцца катацца так, як яна. **(давай)**
7) Антон змог адразу навучыцца катацца на каньках. **(сварыцца)**
8) Першы, каму раскрыў свой сакрэт Антон, быў Янка Маркаўцоў. **(дружыць)**
9) Эма пачала зайздросціць, калі ўбачыла, як Антон умела робіць на лёдзе кругі. **(давай)**

**Прамежкавая рэфлексія**

1) Устаньце, хто лічыць, што памылковых сцвярджэнняў больш, чым правільных.
2) Дакажыце тэкстам памылковасць сцвярджэнняў, адзначаных мінусам (дзеці называюць старонку, зачытваюць патрэбныя радкі з тэксту). Памылковыя сцвярджэнні – 1,2,3,4,5,7,9.
3) Падыміце ручку, хто бездакорна справіўся з заданнем віктарыны.

**2. Характарыстыка герояў.**

– Удакладніць, канкрэтызаваць тэму нашых заняткаў дапаможа наступнае заданне: са слоў, змешчаных пасля сцвярджэнняў, складзіце рэплікі, запішыце іх. Каму яны належаць? У якой сітуацыі былі сказаны?

Адказ:

- Давай не будзем сварыцца, а будзем дружыць.
- Давай дружыць.

Першая рэпліка належыць Эме, другая – Антону. Сітуацыя – дзеці разам катаюцца на лёдзе. Такім чынам, у цэнтры нашай увагі два героі – Эма Пшанічная і Антон Бубноў. Пазнаёмімся з імі бліжэй, для гэтага запоўніце анкету героя (хлопчыкі – Антона, дзяўчынкі – Эмы).

**Анкета для характарыстыкі героя**

1) Імя. Прозвішча.
2) Узрост.
3) Нацыянальнасць.
4) Бацькі.
5) Месца вучобы.
6) Адносіны да вучобы.
7) Захапленні.

8) Адносіны з аднакласнікамі.
9) Адносіны з настаўнікамі.
10) Самая драматычная сітуацыя ў жыцці.

*Вучні агучваюць анкеты (патрабуецца поўны адказ), робяць вывад, што героі маюць шмат агульнага, але ёсць球 рознае.*

– Анкета “5 з 25” дапаможа выявіць, якімі якасцямі адрозніваюцца героі (праца ў парах).

**Анкета “5 з 25”.** Выберыце з прапанаваных 25 асабістых якасцей толькі 5, якія найбольш ярка характарызуюць герояў твора М. Лупсякова:

- адкрытасць, баязлівасць, дабрыня, жартаўлівасць, жорсткасць, зайздрасць,
- злаславасць, кемлівасць, ласкавасць, мужнасць, настойлівасць,
- пакорлівасць, панурасць, працавітасць, самаахвярнасць, смеласць,
- справядлівасць, суровасць, таварыскасць, таленавітасць, упартасць,
- хітрасць, шчырасць, помслівасць, зграбнасць.

*На дошцы змешчаны ватман, на якім надрукаваны вышэй пералічаныя якасці, дзеці наклейваюць стыкеры, робяць адпаведныя вывады.*

**3. Фізкультхвілінка.**

– Калі ласка, устаньце і зрабіце крок наперад, калі пагаджаецеся са мной; крок назад, калі не пагаджаецеся:

1) Я даражу сяброўствам.
2) Я не апускаю рукі перад цяжкасцямі.
3) Я стараюся не зайздросціць таму, хто ў нечым лепшы, чым я.
4) Я імкнуся да таго, каб дасягнуць пастаўленай мэты.

– Усе вы, дзеці, рухаліся наперад. Што значаць гэтыя рухі? Напэўна, тое, што для дасягнення мэты, для рашэння задачы неабходныя крокі – наперад.

**4. Праца з табліцай**

– Хто з герояў апавядання таксама крочыў да ажыццяўлення пастаўленай мэты? Сфармулюйце і запішыце ў сшытак парады, якія спатрэбяцца вам для дасягнення пастаўленай мэты (*дзеці працуюць у групах па чатыры чалавекі).*

| **Цытата** | **Парада** |
|---|---|
| Першы дзень я быў і нос павесіў. У мяне балелі і бакі, і спіна, і ногі. А тут яшчэ я некалькі разоў выцяўся аб лёд … Ішоў дадому і думаў, што я самы нешчаслівы на свеце чалавек. | |
| Назаўтра ісці з канькамі на рэчку мне не хацелася. Але ж перад вачыма ўвесь час стаяла Эма. Ішоў без ніякага жадання, як па прымусу. Хацеў нават вярнуцца з паўдарогі, але перадумаў: яшчэ сёння паспрабую. | |
| Я трохі стаяў на коньках, хоць і змарыўся так, што пот цурком ліўся па твары. Тут патрэбна толькі вытрымка, настойлівасць. | |

| | |
|---|---|
| Чым лепш удавалася мне коўзанне, тым весялейшы я рабіўся. | |
| Добра б было прамчацца ўдваіх па лёдзе навыперадкі. Ды для гэтага мне яшчэ трэба трэніравацца і трэніравацца! | |

*Парады запісваюцца на дошчы ў выглядзе прыступак.*

Прыкладныя варыянты парад:

1) Не вешаць нос!
2) Не здавацца!
3) Быць настойлівым!
4) Радавацца маленькім поспехам!
5) Працаваць над сабой!

– Уважліва паглядзіце на дошку. Што нагадваюць гэтыя запісы? Ці выпадкова яны так размешчаны? Што абазначаюць прыступкі?

**III. Рэфлексія**

Падыміце руку, калі пагаджаецеся:

1) Я зараз адчуваю сябе камфортна.
2) Я адкрыў для сябе нешта новае.
3) Я пераканаўся ў тым, што мастацкія творы павучальныя.
4) Лічу, што працаваў плённа.

**Выстаўленне адзнак, іх каменціраванне. Дамашняе заданне:** патлумачыць пісьмова трыма сказамі назву твора.

**Літаратура**


1. **Лазарук, М. А.** Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2017. – 240 с.: іл.
2. **Міхновіч, Н. А.** Беларуская літаратура. 7 клас: рабочы сшытак / Н. А. Міхновіч. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 127 с.: іл.